**А́НЦАЎ** Міхаіл Васілевіч (12.10.1865, г. Смаленск, Расія — 21.7.1945), кампазітар, харавы дырыжор, педагог. Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1894). З 1896 выкладчык харавых спеваў у розных навучальных установах Віцебска. Адзін з арганізатараў нар. кансерваторыі (1918, чытаў у ёй лекцыі па гісторыі музыкі), кіраўнік Дзяржаўнага хору. Аўтар апрацовак бел. нар. песень «Го-го-го, каза», «А ў полі вярба», «Лучына-лучыначка», «Кума мая, кумачка» і інш., створаных у 1918—21 для хору нар. кансерваторыі. У адрозненне ад распаўсюджаных у той час харавых апрацовак з панаваннем мелодыі верхняга голасу і акампаніруючай функцыяй астатніх галасоў, апрацоўкі А. вызначаліся імкненнем раскрыць асаблівасці нар. шматгалосых харавых спеваў. У апрацоўцы каляднай песні «Го-го-го, каза» для змешанага хору ён стварыў карціну масавай нар. гульнявой дзеі. Уважлівыя адносіны да зместу фалькл. крыніцы прадэманстраваны ў апрацоўцы сямейна-бяседнай песні «Лучына-лучыначка» для змешанага хору, пабудаванай па прынцыпе захавання нар. напеву як тэматычнай асновы. Прадуманая тэмбравая (уключэнні і выключэнні галасоў), рэгістравая (проціпастаўленне нізкага і высокага дыяпазонаў) і танальная (выкарыстанне далёкіх мінорных танальнасцей) драматургія твора садзейнічае ўвасабленню трагічнай напружанасці песеннага сюжэта.

*Літ.*: Смагін А.І. Харавое мастацтва Беларусі XX ст. Мн., 1998. С. 17—18; Антоневич В.А. Белорусская музыка XX в.: Композит. творчество и фольклор. Мн., 2003. С. 90—94.

*К. С. Бандарэнка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ